**Тэставыя заданні па методыцы выкладання беларускай мовы**

Правядзіце ацэнку ўзроўню сваіх прафесійных ведаў. Вашы веды можна лічыць выдатнымі, калі вы здолелі правільна адказаць на ад 29 да 34 пытанняў. На якія пытанні вы не змаглі адказаць? Што вам патрэбна яшчэ вывучыць?

Тэставыя заданні

З пералічаных альтэрнатыў выберыце тыя, якія з'яўляюцца, на ваш погляд, правільнымі адказамі ці меркаваннямі. Абвядзіце выбраны вамі варыянт адказу.

**1. Якое азначэнне з'яўляецца найбольш дакладным?**

- а) Методыка беларускай мовы – гэта асобная навука аб заканамернасцях развіцця асобы дзіцяці ў працэсе навучання беларускай мове.
- б) Методыка беларускай мовы – гэта галіна педагогікі, якая распрацоўвае тэорыю навучання беларускай мове.
- в) Методыка беларускай мовы – гэта навука, якая вывучае працэсы навучання школьнікаў роднай мове і працэсы фарміравання ў іх моўных і маўленчых ведаў, уменняў і навыкаў.
- г) Методыка беларускай мовы – гэта практыка-арыентаваная педагагічная навука, якая раскрывае метадалагічныя асновы, метады, формы навучання беларускай мове.

**2. Галоўным сістэмаўтваральным фактарам у працэсе нвучання беларускай мове выступае:**

- а) метад навучання;
- б) змест навучання;
- в) форма навучання;
- г) прынцып навучання.

**3. Калі навучанне разглядаецца ў адзінстве выкладання і вучэння, то гэта**

- а) агульнапедагагічны аспект;
- б) метадычны аспект;
- в) дыдактычны аспект;
- г) псіхалагічны аспект.
- **4. Да агульных пытанняў методыкі беларускай мовы адносяцца:**
- а) задачы методыкі як навукі;
- б) навучанне розным відам чытання;
- в) заканамернасці і прынцыпы навучання роднай мове;
- г) суадносіны паміж тэарэтычнымі і практычнымі пытаннямі;
- д) развіццё моўнай чуйнасці;
- е) метады даследавання.
- **5. Хто аўтары "Методыкі роднай мовы" (1930г.)**

- а) Язэп Лёсік.
- б) Васіль Ульянавіч Протчанка.
- в) Васіль Паўлавіч Тэпін.
- г) Браніслаў Тарашкевіч.
- д) Канстанцін Міцкевіч.

**6. Выберыце найбольш дакладнае азначэнне агульнай мэты навучання мове.**

- а) Навучанне асновам граматыкі, арфаграфіі і пунктуацыі беларускай мовы.
- б) Фарміраванне лінгвістычнай, камунікатыўнай, моўнай, культуразнаўчай кампетэнцыі.
- в) Фарміраванне камунікатыўных уменняў і творчых здольнсцей.
- г) Фарміраванне лінгвістычных ведаў і ўменняў, а таксама прывіццё цікавасці і любві да вывучэння роднай мовы.

**7.Што адносіцца да развіццёвых задач навучання беларускай мове?**

- а) Авалоданне тэрмінамі і паняццямі літаратурнай мовы.
- б) Выхаванне ўважлівага і адказнага стаўлення да слова.
- в) Развіццё моўнай памяці і маўленчага слыху.
- г) Авалоданне прыёмамі лагічнага мыслення і маўленчага слыху.

**8. Што ўяўляе сабой праграма па беларускай мове?**

- а) Вучэбная праграма вызначае парадак вывучэння курса беларускай мовы, колькасць гадзін па тэмах, пачатак і канец чвэрці, года
- б) У вучэбнай праграме вызначаны змест і аб'ём ведаў па кожнай граматычнай тэме, колькасць гадзін, што адводзяцца на вывучэнне пэўных пытанняў курса, у тым ліку і на пісьмовыя работы.
- в) Дакумент, які вызначае змест і аб'ём прадмета "Беларуская мова", кола лінгвістычных і маўленчазнаўчых ведаў і ўменняў, якія падлягаюць абавязковаму засваенню школьнікамі кожнага класа.

**9. Выберыце азначэнне, якое адлюстроўвае сучасны змест навучання беларускай мове ў старэйшых класах.**

- а) Забеспячэнне практычнага выкарыстання вучнямі лінгвістычных ведаў і уменняў, авалоданне ўменнямі і навыкамі ў прадуцыраванні пісьменнай літаратурнай мовы.
- б) Паглыбленне ўяўлення аб функцыянаванні адзінак мовы і іх спецыфічнае выкарыстанне ў маўленні ў залежнасці ад тыпу і стылю маўлення.
- в) Паўтарэнне і сістэматызацыя вывучанага па граматыцы і маўленні, арфаграфіі і пунктуацыі.
- г) Авалоданне навыкамі пабудовы выказвання і аналізу тэксту ў вуснай і пісьмовай форме.

**10. Асноўныя напрамкі работы па развіцці маўлення ў базавай агульнаадукацыйнай школе:**

а) авалоданне асноўнымі паняццямі, фактамі, законамі, моўнымі тэрмінамі;

- б) аваладанне нормамі літаратурнай мовы;
- в) выхаванне эстэтычных адносін да слова;
- г) развіццё вобразнага мыслення школьнікаў;
- д) узбагачэнне слоўніка і граматычнага ладу школьнікаў;
- е) аваладанне школьнікамі ўменнямі і навыкамі ў стварэнні звязных выказванняў.

**11. Па якой прыкмеце вызначаецца тып і структура ўрока беларускай мовы?**

- а) Па дыдактычных мэтах навучання роднай мове;
- б) па размяшчэнні элементаў урока;
- в) па назве кампанентаў, колькасці структурных элементаў урока;
- г) па дзейнасці настаўніка.

**12. Выберыце формы арганізацыі вучэбнай дзейнасці:**

- а) алімпіяда;
- б) факультатыў;
- в) гурток;
- г) урок;
- д) канферэнцыя.

**13. Да аналітычных практыкаванняў па беларускай мове адносяцца:**

- а) сачыненне;
- б) творчы дыктант;
- в) ускладненае спісванне;
- г) арфаграфічнае каменціраванне.
- **14. Тэксты падручніка і вучэбных дапаможнікаў уяўляюць сабой:**
- а) змест навучання беларускай мове;
- б) тэарэтычны метад навучання роднай мове;
- в) сродак навучання;
- г) від практыкаванняў для паўтарэння.

**15. Пазнавальная цікавасць да прадмета – гэта:**

- а) імкненне да пазнання моўных з’яў з выкарыстаннем лінгвістычных звестак як інструмента пазнання;
- б) элементарная стадыя выбіральных адносін, абумоўленых знешнімі ўмовамі, да з’яў роднай мовы;
- в) каштоўны стан асобы, які характарызуецца імкненнем школьніка пранікнуць за мяжу ўбачанага ці пачутага;
- г) сутнасная сіла чалавека, якая забяспечвае яго самазахаванне, самаразвіццё, актыўнасць у акаляючым свеце.

**16. Фактары, якія ўплываюць на развіццё пазнавальнай цікавасці:**

- а) веды рэпрадуктыўнага характару;
- б) гістарычны каментарый моўных з’яваў;
- в) пераадоленне інтэлектуальных цяжкасцей;
- г) дыдактычныя моўныя гульні;
- д) заданні міжпрадметнага характару;

- е) самастойная праца з падручнікам.

**17. Стратэгічныя прынцыпы навучання мове (па А.Дуднікаву):**

- а) структурна-семантычны прынцып вывучэння моўных адзінак;
- б) разіццё маўлення школьнікаў – вядучы прынцып навучання роднай мове;
- в) раскрыццё эстэтычнай функцыі мовы, выяўленча-эстэтычнай значнасці лінгвістычных элементаў;
- г) прынцып увагі да матэрыі мовы;
- д) прынцып супастастаўлення вуснага і пісьмовага маўлення;
- е) адначасовае развіццё маўлення і актывізацыя разумовай дзейнасці школьнікаў.

**18. Лінгвістычная кампетэнцыя ўключае ў сябе:**

- а) веды асноў навукі аб мове;
- б) веды аб гісторыі навукі і метадах лінгвістычнага аналізу;
- в) веды, неабходныя для разумення чужых выказванняў;
- г) веданне беларускага маўленчага этыкету.

**19. Выберыце правільнае сцверджанне.**

- а) Камунікатыўная кампетэнцыя – гэта асэнсаванне мовы як формы выражэння нацыянальнай культуры, узаемасувязі мовы і гісторыі народа, нацыянальна-культурнай спецыфікі роднай мовы;
- б) Камунікатыўная кампетэнцыя – авалоданне ўсімі відамі маўленчай дзейнасці і асновамі культуры вуснага і пісьмовага маўлення, уменне выкарыстоўваць веды ў розных сферах і
- в) Камунікатыўная кампетэнцыя – прымяненне лінгвістычных ведаў і ўменняў ва ўласнай маўленчай практыцы;
- г) Камунікатыўная кампетэнцыя – запатрабаванасць у лінгвістычным і камунікатыўным самаўдасканаленні.

**20. Прынцыпы вывучэння словаўтварэння ў школе:**

- а) сістэматычнае супастаўленне структуры слова і спосабу яго ўтварэння (структурна-словаўтваральны прынцып);
- б) навучанне нормам лексічнай спалучальнасці слоў;
- в) фарміраванне базавых марфалагічных паняццяў;
- г) дыяхранічны прынцып;
- д) гэта:супастаўленне літар і гукаў у слове.

**21. Марфалагічныя памылкі школьнікаў – гэта:**

- а) парушэнне ўтварэння граматычных формаў;
- б) парушэнні пры выкананні марфалагічных практыкаванняў;
- в) памылкі ў кіраванні;
- г) парушэнне лексічнай спалучальнасці.

**22.Пунктуацыйныя ўменні фарміруюцца ў курсе:**

- а) 8 і 9 класаў;
- б) вывучэння лексічных тэм;
- в) 5, 8-9 класаў.

- г) на працягу вывучэння ўсяго школьнага курса мовы

**23. Суб’ектыўныя прычыны пунктуацыйных памылак у старэйшых класах:**

- а) сэнсавым разборам сказа;невалоданне сінтаксічным і
- б) частае выкарыстанне ў самастойных працах складаных сінтаксічных канструкцый;
- в) разбурэнне ведаўпра апазнавальныя прыкметы сэнсавых адрэзкаў;
- г) невалоданне лексікай беларускай мовы;

**24.** Слоўнікава-арфаграфічная праца праводзіцца:

- а) на этапе вывучэння новага матэрыялу;
- б) на этапе кантролю ведаў ў форме слоўнікавага дыктанта;
- в) на этапе абагульнення, сістэматызацыі арфаграфічных уменняў;
- г) у працэсе вывучэння граматычнай тэмы.

**25. Арфаграфічныя паняцці, якія засвойваюцца школьнікамі:**

- а) апазнавльная прымета арфаграмы;
- б) цяжкі выпадак у прымяненні арфаграфічнага правіла;
- в) умовы выбару арфаграмы;
- г) тып і від арфаграмы.

**26. Практыкаванні на фарміраванне пачуцця нормы:**

- а) аналіз выказванняў выдатных айчынных і замежных дзеячаў пра беларускую мову;
- б) знаходжанне ў тэксце лексічных і граматычных памылак і іх выпраўленне;
- в) пастаяннае правядзенне работы над памылкамі ў самастойных пісьмовых працах;
- г) групіроўка канкрэтных моўных з’яваў.
- **27. Творчыя працы па беларускай мове:**
- а) дыктант са змяненнем зместу;
- б) размеркавальны дыктант;
- в) ускладненае спісванне;
- г) складанне абагульняльнай табліцы.

**28. Прынцыпы слоўнікава-арфаграфічнай працы:**

- а) экстралінгвістычны;
- б) парадыгматычны;
- в) гістарычны;
- г) логіка-пазнавальны.

**29 На ўроках вывучэння сінтаксісу праводзяцца маўленчыя практыкаванні:**

- а) на пабудову і канструяванне сказаў з вывучаемымі моўнымі сродкамі;
- б) на вызначэнне апазнавальных прыкмет сэнсавых адрэзкаў;
- в) на тлумачэнне знакаў прыпынку;
- г) на замену канструкцый сінанімічнымі.

**30. Стварэнне асобай прасторы вучэбнай дзейнасці, у якой вучань самастойна арыентуецца ў дзейнасці вучэння і выбірае ўласныя спосабы засваення матэрыялу:**

- а) дыферэнцыраванае навучанне;
- б) камунікатыўны падыход;
- в) індывідуальнае навучанне;
- г) камунікатыўна-дзйнасны падыход.
-

Адказы

1 – г, в
2 - б
3 - в
4 – а, в, г, е
5 – в, д
6 - б
7 – в, г
8 - в
9 - а
10 – б, д, е
11 - а
12 – б, г
13 – в, г
14 - в
15 – б
16 – б, в, г, е
17 – б, в, е
18 – а, б
19 – б
20 – а, г, д,
21 -
22 -
23 - г
24 -
25 – а,г
26 – б, в
27 - а
28 -
29 – а, г
30 - г